группы; страх исключения из группы; желание соответствовать существующим в обществе стереотипам; подражание; любопытство; стремление к независимости. Особенно подчеркивалось влияние поддерживаемого в обществе стереотипа курящего человека как более успешного во всех отношениях, а также неявная реклама курения в художественных фильмах.

Причины, влияющие на продолжение курения, не вызвали такой же однозначной оценки, как причины начала курения. Одни причины поддерживались группой, другие не находили подобного отклика или дополнялись существенными, по мнению высказывавшихся, нюансами. Если объединить множество полученных вариантов ответов, то можно выделить следующие причины, из-за которых, по мнению участвовавших в группах студентов, люди начинают курить регулярно: зависимость; привычка; преодоление стрессовых ситуаций; курение как расслабляющий фактор; соблюдение ритуалов, связанных с курением.

Важно отметить, что зависимость рассматривается студентами только как психологическая – зависимость от ситуации, от окружения. Зависимость от никотина (физическая зависимость) воспринимается ими как наиболее легкий в преодолении фактор на пути к отказу от курения. Наибольшие трудности вызывает преодоление своей психологии, желания (привычки?) взять сигарету и закурить. Очень многие говорят о том, что курят по привычке. Курение стало неотъемлемой частью их жизни, как умываться или чистить зубы. В некоторых случаях курение превращается в своего рода автоматизм. Курящие даже не всегда замечают, что прикурили сигарету, и могут не помнить, курили только что или нет.

## СТАНАЎЛЕННЕ СВЕЦКАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ ПАД УПЛЫВАМ РЭФАРМАЦЫЙНЫХ ІДЭЙ

**А. А. Плюта**

На працягу XVI – XVII ст. у Беларусі, якая ў той час уваходзіла ў склад Вялікага княства Літоўскага, а затым і Рэчы Паспалітай, складваюцца рэальныя перадумовы станаўлення духоўнай культуры новага тыпу. Стварэнне адзінай, адносна цэнтралізаванай дзяржавы, што выйшла на міжнародную арэну і ўяўляла сабой значную сілу, узмоцненыя сувязі з Заходняй Еўропай, рост палітычнай вагі сярэдняга і дробнага дваранства, рэфармацыйны рух, што пашырыў палітычныя, эканамічныя і культурныя сувязі са знешнім светам,

з'яўленне кнігадрукавання, пашырэнне сеткі навучальных установаў – усё гэта садзейнічала разбурэнню многіх састарэлых стэрэатыпаў мыслення і стварэнню самастойных, арыгінальных айчынных духоўных каштоўнасцей.

Пра сапраўды свецкі характар духоўнай культуры Беларусі XVI ст. можна казаць толькі з прыходам Рэфармацыі. Менавіта Рэфармацыя з'явілася ўвасабленнем крытычнага духу эпохі. Тэрмін «reformatio» (ад лац. – пераўтварэнне) гаворыць сам за сябе: рэфамацыя як пераўтварэнне ўсяго спектра чалавечага быцця – ад рэлігійна-царкоўнага да ўсеагульнай перабудовы.

Рэфармацыя была выклікана зменамі ў эканамічным, сацыяльна-палітычным і ідэйным жыцці ВКЛ, у тым ліку ростам гарадоў, эканамічным, культурным уздымам, фарміраваннем беларускай нацыянальнай самасвядомасці. Яна мела сваім вынікам узнікненне і зацвярджэнне новай сістэмы светаадчування, якая перавярнула ўсе ўяўленні аб чалавечым грамадстве, дзяржаве, аб іх сутнасці і ўзаемаадносінах.

Прыкметы крызісу ва ўнутраным жыцці царквы (кансерватызм духавенства, адмоўнае стаўленне да свецкай і народнай культуры, адарванасць ад надзённых сацыяльных праблем чалавека), няздольнасць традыцыйных інстытутаў аб'яднаць грамадства і забяспечыць яго дабрабыт садзейнічалі пашырэнню пратэстанцкіх ідэй. Рэфармацыя дапамагала чалавеку вырвацца з абдымкаў царкоўнай ідэалогіі, абгрунтоўвала яго права на ўласную трактоўку Бога, на творчасць. Гэта было першае абгрунтаванне права чалавека на свабоду, няхай толькі і на рэлігійную. Але з прынцыпу рэлігійнай свабоды вырастаюць прынцыпы маральнай, інтэлектуальнай і прававой свабоды чалавека.

Рэфармацыя паказала чалавеку яго месца ў сусвеце, яго сапраўднае прызначэнне. З выканаўцы боскіх загадаў чалавек ператвараецца ў творцу, становіцца ў цэнтр сусвету. Чалавек становіцца вольнай і самастойнай асобай, здольнай тварыць культуру. Гэта была новая, свецкая культура, звернутая да чалавека. І як піша Р.Д. Грудніцкі: «Праз гэтую культуру, праз сваю здольнасць надаваць прыродзе высакароднасць, чалавек узвышаўся над абмежаванасцю свайго фізічнага існавання, пераадольваў сваю канечнасць і далучаўся да гарманічнае бясконцасці сусветнага універсуму» [1, с. 9].

Глыбокія сацыяльна-эканамічныя і палітычна-культурныя змены на працягу ўсяго XVI ст. прывялі да карэнных зрухаў ва ўсіх структурах грамадства, а таксама да змены месца асобнага чалавека і

розных сацыяльных груп у гэтых структурах. Новыя сацыяльныя сілы, што выступілі на грамадска-палітычную авансцэну, разарвалі ўсеабдымнае адзінства і ланцугі старой традыцыі [2, с. 48]. Гэтыя працэсы былі звязаны з фарміраваннем ідэй індывідуальнай свабоды, самакаштоўнасці асобы, прыроджаных, неадчужальных правоў кожнага чалавека на жыццё і самарэалізацыю. Найлепшым шляхам самарэалізацыі асобнага індывіда з’яўлялася прадастаўленне яму як мага большай свабоды для здзяйснення дзеянняў, якія дыктаваліся яго розумам. Але на шляху асабістай свабоды як асноўнай умовы грамадска-гістарычнага прагрэсу стаялі састарэлыя грамадска-палітычныя інстытуты, рэлігійная схаластыка і феадальная дзяржава. Таму рэфарматарская думка Адраджэння стварае канструктыўную праграму грамадскіх пераўтварэнняў.

Рэфармацыя ў ВКЛ, якая таксама з’яўлялася вынікам іманентных грамадскіх працэсаў, што адбываліся на яго тэрыторыі, аказвала вялікі ўплыў на развіццё айчыннага матэрыяльнага і духоўнага жыцця XVI–XVII ст., у прыватнасці філасофскай і грамадска-палітычнай думкі. Рэфармацыйны рух актывізаваў сацыяльна-палітычную дзейнасць усіх грамадскіх колаў беларуска-літоўскага насельніцтва, абвастрыў рэлігійную і саслоўна-класавую барацьбу, садзейнічаў правядзенню шэрагу дзяржаўных рэформ, развіццю ў краіне адукацыі, кнігадрукавання, роднай мовы і літаратуры, узмацненню міжнародных кантактаў, павышэнню цікавасці да духоўнай спадчыны Адраджэння, зацвярджэнню прынцыпова новага тыпу разумовай дзейнасці.

Было б памылкай ідэалізаваць новы тып светапогляду. Ён заставаўся ў цэлым рэлігійным, але змяняўся сэнс і змест гэтай рэлігійнасці. Відазмененае і паглыбленае разуменне хрысціянства, прапанаванае рэфарматарамі, азначала паварот у бок новага складу мыслення і супярэчлівым дыялектычным шляхам вяло да пераадолення рэлігійных форм грамадскай свядомасці [3, с. 253]. Пачатковы этап гэтага працэсу насіў прыхаваны характар і выражаўся ў накапленні рацыяналістычных элементаў, у асэнсаванні рэлігійнага вучэння і ў станаўленні рэлігійнага суб’ектывізму. Пратэстантызм быў глыбока асабістым вучэннем, арыентаваным на індывідуальную свядомасць суб’екта. Паколькі для выратавання было дастаткова адной толькі веры, перад кожным чалавекам адкрываўся шлях да Бога. А гэта прыводзіла да разумення свабоды ад дэспатычнай улады царкоўнай догмы. Ідэя роўнай нікчэмнасці ўсіх перад Богам трансфармавалася пазней у ідэю роўнасці ўсіх перад законам.

У выніку падрыву ўлады царквы, аддзялення адно ад аднаго матэрыяльнага і ідэальнага, быў пакладзены пачатак разбагаўленню рэчаіснасці і фарміраванню навукі і свецкай культуры.

Яшчэ адным важным вынікам Рэфармацыі было станаўленне тых плыняў грамадска-палітычнай думкі, якія прыводзілі ў гістарычнай перспектыве да паступовага пераадолення рэлігійнай абалонкі духоўнай культуры, да яе больш ці менш паслядоўнай секулярызацыі [3, с. 251].

Грамадска-палітычнай думкай перыяду Рэфармацыі быў выпрацаваны новы погляд на сутнасць і прызначэнне дзяржавы. У адрозненне ад сярэднявечнага ўяўлення аб боскім паходжанні і сутнасці дзяржавы, якое фактычна прыводзіла дзяржаўнае кіраўніцтва да ўсёдазволенасці, у рэфармацыйны перыяд прадугледжваецца абмежаванне дзеянняў феадалаў і пэўныя захады па абароне жыцця ўсіх грамадзян. Такі ўзлёт айчыннай прававой думкі, які падмацоўваўся даволі дасканалай судовай практыкай, накладваў адбітак на існуючыя ідэі і погляды адносна грамадскага ўладкавання, правіл супольнага жыцця, практычных маральных прынцыпаў і норм.

Новая праграма рэфармавання была падрыхтавана часам, бо выражала жаданне і здольнасць грамадства да пераўтваральнай дзейнасці. Неабходна было толькі ўвасобіць у жыццё прыроджанае імкненне чалавечай натуры да свабоды і роўнасці, існаванне якіх было звязана з шырокімі юрыдычнымі гарантыямі, гэта значыць з прававым рэгуляваннем усёй сферы грамадскіх адносін. Такая пераўтваральная праграма мусіла стаць лепшым узорам развіцця свецкай культуры ва ўсёй Еўропе.

Такім чынам, філасофскі прагрэс, які намеціўся ў перыяд гуманістычнага і рэфармацыйнага руху, вызначаўся як колькасцю новых, сапраўды прагрэсіўных ідэй, так і маштабам ідэй старажытных, якія фарміравалі і накіроўвалі развіццё разумовай дзейнасці, вызначалі яе характар і своеасаблівасць.

**Літаратура**


1. *Грудніцкі Р.* Андрэй Волан: Жыццё дзеля свабоды // Край. Наваполацк, 1997.
2. *Гаджиев К.С.* Политическая философия. М., 1999.
3. *Дмитриев М.В.* Влияние Реформации на общественную мысль украинско-белорусских земель Речи Посполитой во второй половине 16 – первой половине 17 в. // Отечественная общественная мысль эпохи средневековья. Киев, 1978.